23/II 1918 **ЗЬВЯЗДА** 23/II 1928

Орган Цэнтральн. Камітэту камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Мен. АККП(б)Б.

# УсеКП(б)—правадыр і будаўнічы Чырвонай Арміі.

# Цясьней згуртуем баявыя рады вакол УсеКП(б) і яе ленінскага ЦК

## АДОЗВА

**Да рабочых і сялян, да ўсіх працоўных Беларусі**

**ТАВАРЫШЫ!**

За 10-годзьдзем Кастрычнікавай рэвалюцыі працоўныя Савецкага Саюзу сьвяткуюць дзесяцігодзьдзе рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі.

Ня тольні ваенныя, але і палітычныя і гаспадарчыя посьпехі СССР за мінулыя 10 год цесна зьвязаны з барацьбой і перамогамі Чырвонай арміі. Бяз Чырвонай арміі, як узброенай апоры пралетарскай дыктатуры, бяз Чырвонай арміі, як клясавай арміі пралетарскай рэвалюцыі, немагчымы былі-б перамога і панаваньне пралетарскае дыктатуры на працягу першага 10-годзьдзя будаўніцтва сацыялізму.

Адзінай узброенай сілай, якую мела пралетарская дыктатура ў першыя месяцы свайго панаваньня, былі рабочыя атрады Чырвонай гвардыі. Распыленыя па франтох грамадзянскай вайны, насьпех утвораныя, слаба ўзброеныя і дрэнна навучаныя, але самаахвярна адданыя пралетарскай рэвалюцыі і поўныя жалезнай клясавай волі да рашучай перамогі,—рабочыя атрады Чырвонай гвардыі мужна адбівалі наступленьні сусьветнай контр-рэвалюцыі на пралетарскую дзяржаву.

Але канчаткова перамагчы ворага, на баку якога былі гатовыя ўзброеныя сілы з большай баявой практыкай і высокай ваеннай тэхнікай, было немагчыма.

У самы разгар грамадзянскай вайны, на палёх бою, партыя Леніна перабудавала рабочыя атрады Чырвонай гвардыі ў Чырвоную армію. Яна кінула ў яе рады сотні тысяч лепшых рабочых і камуністых. Атрады гэтых рабочых і камуністых вынесьлі ў Чырвоную армію сваю мужнасьць, жалезную пралетарскую дысцыпліну, самаахвярную адданасьць справе пралетарскай рэвалюцыі і гэтым забясьпечылі перамогу.

Тольні на аснове баявога саюзу пралетарыяту і працоўнага сялянства магла камуністычная партыя, якая апіралася на паліторганы, камісараў і ячэйкі ў арміі, згуртаваць Рабоча-Сялянскую Чырвоную армію ў непераможную сілу.

Па сканчэньні грамадзянскай вайны Чырвоная армія, пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі робіць пераход ад вайны да міру, ператвараючы баявыя часьці ў працоўныя арміі, і прымае ўдзел у працы па аднаўленьні зруйнаванае белагвардзейцамі гаспадаркі.

Зарадзіўшыся ў агні рэвалюцыі, створаная партыяй дыктатуры пралетарыяту для барацьбы супроць памешчыкаў і буржуазіі, да сучаснага мо[illegible] тысяч рабочых і сялян зьяўляецца не тольні школай вайсковае справы, але




## УРАД БССР—ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Адозва ЦВК і СНК Беларускае ССР

## ДЭКРЭТ

**Савету Народных Камісараў аб Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі**

I.

*Савет Народных Камісараў пастанаўляе: арганізаваць новую армію пад назваю «Рабоча-Сялянская Чырвоная армія», на наступных асновах:*

*1. Рабоча-Сялянская Чырвоная армія ствараецца з найбольш сьвядомых і арганізаваных элемэнтаў працоўных клясаў.*

*2. Доступ у яе рады адкрыты для ўсіх грамадзян Расійскай Рэспублікі, не маладзей 18 год.*

*Для паступленьня ў рады Чырвонай арміі неабходны рэкамэндацыі вайсковых камітэтаў ці грамадзкіх дэмакратычных арганізацый, што стаяць на пляцформе савецкай улады, партыйных і прафэсыянальных арганізацый ці, прынамсі, двух членаў гэтых арганізацый. Пры ўступленьні цэлымі часьцямі патрабуецца кругавая парука ўсіх і паіменнае галасаваньне.*

II.

*1. Ваякі Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі знаходзяцца на поўным дзяржаўным харчаваньні і, звыш таго, атрымліваюць па 50 руб. у месяц.*

*2. Непрацаздольныя члены сем'яў салдат Чырвонай арміі, якія раней знаходзіліся на іх утрыманьні, забясьпечваюцца ўсім неабходным па мясцовых спажывецкіх нормах, згодна пастановы мясцовых органаў савецкай улады.*

III

*Вярхоўным кіруючым органам Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі зьяўляецца Савет Народных Камісараў. Непасрэднае кіраўніцтва арміяй сканцэнтравана ў Камісарыяце па вайсковых справах у створанай пры ім асобнай Усерасійскай калегіі.*

